УДК 94 (476):[377.1:63]-053.81

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў ІДЭАЛОГІІ І ПРАКТЫЦЫ САЮЗА СЕЛЬСКАЙ МОЛАДЗІ – САЮЗА МАЛАДОЙ ВЁСКІ

***Віталій Крывуць***
*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Баранавічы, Беларусь*
krivut@mail.ru

Нацыянальнае пытанне знайшло пэўнае адлюстраванне ў ідэалогіі праўрадавага руху сельскай моладзі міжваеннай Польшчы. Прадугледжвалася як эміграцыя яўрэйскай меншасці, так і братэрскае супрацоўніцтва са славянскімі меншасцямі. Але ў рэчаіснасці, у апошнім выпадку, ідэйныя пастулаты заставаліся толькі на паперы. На практыцы ажыццяўляўся курс на паланізацыю вясковай моладзі, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

***Ключавыя словы: сельская моладзь, маладзёжныя арганізацыі, нацыянальныя адносіны, міжваенны перыяд, Заходняя Беларусь***

# NATIONAL ISSUE IN THE IDEOLOGY AND PRACTICE OF THE UNION OF RURAL YOUTH - UNION OF YOUNG VILLAGE

***Vitali I. Kryvuts***
*Baranovichi State University, Baranovichi, Belarus*

The national issue was reflected in the ideology of the pro-government rural youth movement in interwar Poland. Both the emigration of the Jewish minority and fraternal cooperation with the Slavic minorities were envisaged. But in reality, in the latter case, ideological postulates remained only on paper. In practice, a course was carried out for the polonization of rural youth, including in Western Belarus.

***Key words: rural youth, youth organizations, national relations, interwar period, Western Belarus***

У міжваенны перыяд у польскай дзяржаве, у тым ліку і на акупаванай тэрыторыі Заходняй Беларусі, дзейнічаў шэраг праўрадавых маладзёжных арганізацый. К канцу 1930-х гг. адным з найбольш уплывовых і масавых сярод іх быў Саюз маладой вёскі (СМВ). Па падліках польскіх гісторыкаў, агульная колькасць яго членаў у 1938 г. дасягнула 170 000 чалавек [1, с. 165]. Што тычыцца непасрэдна Заходняй Беларусі, то ў Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах на той мамант было зарэгістравана 1 208 гурткоў СМВ, якія налічвалі 36 275 членаў [2, с. 30].

Неабходна адзначыць, што к гэтаму часу дадзенае аб’яднанне прайшло значную арганізацыйную эвалюцыю. Першыя гурткі сельскай моладзі ўзніклі на этнічных польскіх землях яшчэ да Першай сусветнай вайны. У чэрвені 1919 г. у Варшаве адбыўся з’езд, на якім было заяўлена пра стварэнне Цэнтральнага саюза сельскай моладзі (ЦССМ). Галоўнай задачай арганізацыі былі “выхаванне і падрыхтоўка добрых, разумных і актыўных грамадзян Польшчы”. Планавалася ажыццяўляць гэта праз правядзенне шырокай культурна-асветніцкай працы, ваеннай падрыхтоўкі і фізічнага выхавання. Пры гэтым адзначалася, што арганізацыя “абапіраецца на гранітны фундамент хрысціянскага вучэння, імкнецца да актыўнай яго рэалізацыі ў асабістым і калектыўным жыцці праз выкананне прынцыпаў любві і братэрства” [3, с. 147].

У 1928 г. у ЦССМ адбыўся раскол на базе адносін на “санацыі”. Праціўнікі кіруючага рэжыму стварылі Саюз сельскай моладзі Рэчы Паспалітай “Віцы”. Прыхільнікі “санацыі” арганізавалі Саюз сельскай моладзі “Сеў” (ССМ “Сеў”). Пры гэтым на тэрыторыі Заходняй Беларусі большая частка арганізацый сельскай моладзі падтрымала “санацыю” [4, с. 5 – 6]. На Палессі і Віленшчыне дзейнічалі ваяводскія філіялы ССМ. А ў Навагрудскім ваяводстве пасля расколу ЦССМ аформіўся аўтаномны Саюз сельскай моладзі Навагрудскай зямлі. У 1930 г. на спецыяльным з’ездзе гэтай арганізацыі было прынята рашэнне “у імя дабра маладой ускраіннай вёскі і ў імя дзяржаўнай справы захаваць самастойнасць і незалежнасць ад цэнтралей у Варшаве, каб абараніць нашу тэрыторыю ад непажаданай і шкоднай арганізацыйнай барацьбы ў нездаровай атмасферы” [5, арк. 4]. Аднак гэтая аўтаномія была вельмі адноснай. Так навагрудскі саюз накіроўваў сваіх дэлегатаў на ўсе канферэнцыі і курсы, якія праводзіў ССМ “Сеў”, а таксама выкарыстоўваў яго выдавецкія магчымасці [6, с. 65].

Арганізацыйная раздробленасць праўрадавага руху сельскай моладзі значна зніжала яго эфектыўнасць. Неабходна ўлічваць і тое, што сур’ёзным канкурэнтам праўрадавых саюзаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў мясцовы камсамол, які з’яўляўся найбольш рашучым праціўнікам афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. У сувязі з гэтым польскія ўлады ўзялі курс на аб’яднанне і ўніфікацыю “сваіх” саюзаў сельскай моладзі. У выніку 4 верасня 1934 г. ССМ “Сеў” аб’яднаўся з шэрагам іншых, у тым ліку і рэгіянальных арганізацый. Так узнік Саюз маладой вёскі. У кіраўніцтве новай арганізацыі вядучую ролю адыгрывалі былыя функцыянеры ССМ “Сеў” [7, с. 19].

У статуце СМВ аб’яўляўся “аб’яднаннем ваяводскіх і рэгіянальных саюзаў сельскай моладзі”, якое мае мэтай інтэлектуальнае, этычнае, грамадскае, фізічнае і прафесійнае выхаванне чалавека ў духу поўнага развіцця яго асобы і падрыхтоўкі яго да творчага і арганізаванага ўдзелу ў жыцці вёскі, нацыі і дзяржавы [8, с. 1 – 2]. Зразумела, што ў статуце мелася на ўвазе жыццё польскай нацыі і польскай дзяржавы.

Тым не менш, кіраўніцтва праўрадавага руху сельскай моладзі павінна было ўлічваць шматнацыянальны характар тагачаснай польскай дзяржавы. Згодна са статутнымі дакументамі, членамі ССМ маглі быць паўналетнія грамадзяне Польшчы [9, с. 4]. Гэта значыць, што фармальна ў арганізацыю маглі ўступаць і маладыя вяскоўцы-беларусы. Аднак, ідэйныя дакументы ССМ фактычна не закраналі нацыянальнага пытання. У якасці прыкладу можна прывесці “Ідэйныя дырэктывы Цэнтральнага саюзу сельскай моладзі” (1933 г.), у якіх нават не ўпамінаецца пра нацыянальныя меншасці тагачаснай польскай дзяржавы [10].

Сітуацыя змянілася пасля стварэння СМВ. У чэрвені 1937 г. кіраўнік саюза С. Герат на кангрэсе арганізацыі ў Варшаве зрабіў даклад на тэму “Ідэйна-выхаваўчыя прынцыпы Саюза маладой вёскі”. У ім былі сцісла сфармуляваны пазіцыі СМВ у адносінах да шэрагу праблем (абараназдольнасць дзяржавы,

рэлігія, культура і асвета, эканамічныя праблемы, выхаваўчыя задачы). Таксама дакладчык закрануў праблему нацыянальных меншасцей тагачаснай Польшчы. У адносінах да яўрэяў дэкларавалася наступнае; “Асуджаючы ўсе жорсткія гвалты, як прыніжальныя для душы польскага народу, мы, аднак, заяўляем, што ў перанаселенай польскай дзяржаве эміграцыя павінна ўключаць у першую чаргу яўрэйскія масы, як элемент чужы польскай нацыі і шкодны для эканамічнага жыцця Польшчы” [11, с. 416].

Што тычыцца славянскіх меншасцей, беларусаў і украінцаў, то ў адносінах да іх было заяўлена пра імкненне да братэрства, “заснаванага на асноўных прынцыпах патрыятычнай сялянскай ідэалогіі”. Таксама падкрэслівалася своеасаблівая “цывілізатарская” місія СМВ: “Усю ўнутраную энергію на нацыянальных тэрыторыях мы накіроўваем на ўдасканаленне культуры і цывілізацыі і на выраўноўванне ўзроўню з землямі цэнтральнай і заходняй Польшчы” [11, с. 416 – 417].

Дадзеныя пастулаты знайшлі адлюстраванне і ў “Ідэйна-выхаваўчай дэкларацыі” СМВ. Яна была прынята на з’ездзе дэлегатаў саюза ў Варшаве 19 снежня 1937 г. Дэкларацыя зноў называла яўрэйскае насельніцтва чужым для польскай нацыі элементам, які неабходна браць пад увагу пры складанні эміграцыйнага плану для празмернага насельніцтва [12, с. 6]. Такі падыход цалкам адпавядаў ідэям “санацыйнага” лагера, які імкнуўся вырашыць “яўрэйскае пытанне” праз эміграцыю.

Дарэчы, у канцы 1937 г. Назіральная рада СМВ апублікавала спецыяльную пастанову адносна “яўрэйскага пытання”. У ёй яўрэі абвяшчаліся “перашкодай на шляху да свабоднага развіцця нашага нацыянальнага жыцця, як у гаспадарчай, так і ў культурнай і грамадскай сферах”. Было заяўлена, што ў хуткім, але мірным і гуманітарным вырашэнні “яўрэйскага пытання” зацікаўлена не толькі польская нацыя, але і масы яўрэйскага насельніцтва. Такім вырашэннем прызнавалася эміграцыя. Акрамя таго, сцвярджалася, што сапраўднаму вырашэнню праблемы будзе садзейнічаць рэалізацыя праграмных прынцыпаў СМВ, у тым ліку: а) хуткае правядзенне аграрнай рэформы, “дзякуючы чаму знікне значная колькасць вялікіх зямельных уладанняў, якія трымаюць у арэндзе яўрэі”; б) доступ вясковай моладзі да прафесійнай, сярэдняй і вышэйшай адукацыі, “што будзе самым эфектыўным сродкам вызвалення ад яўрэяў эканамічнага жыцця і вольных прафесій і супрацьдзеяння ўсё большаму пранікненню яўрэяў у публічнае жыццё”. Адначасова асуджаўся антысеміцкі гвалт, які вядзе “да здзічэння культуры і анархіі публічнага жыцця”. Кіраўніцтва СМВ рашуча супрацьстаяла такім метадам і заклікала не дапускаць іх пераносу ў вёску [13, с. 2].

Калі вяртацца да славянскіх меншасцей Польшчы, то “Ідэйна-выхаваўчая дэкларацыя” СМВ, як і раней, падкрэслівала імкненне да паглыблення братэрства на аснове “патрыятычнай сялянскай ідэалогіі”. Гэтая ідэалогія, на думку аўтараў дэкларацыі, выцякае з пачуцця дзяржаўнага адзінства. Таксама дэкларавалася імкненне саюза да “рэалізацыі агульных і вялікіх мэт Рэчы Паспалітай” [12, с. 6].

Фактычна СМВ падтрымліваў “санацыйную” палітыку дзяржаўнай асіміляцыі беларусаў і украінцаў, прыкрываючыся прыгожымі словамі пра братэрства славянскіх народаў. На практыцы да рэальнага братэрства ў дзейнасці ССМ – СМВ на тэрыторыі Заходняй Беларусі было вельмі далёка. Гэта выдатна дэманструе нацыянальны склад арганізацыі ў рэгіёне.

У заходнебеларускіх ваяводствах членамі ССМ – СМВ былі дзеці працаўнікоў мясцовай польскай адміністрацыі, асаднікаў, палякаў і беларускіх сялян польскай арыентацыі [14, с. 297]. У якасці прыкладу можна прывесці дадзеныя пра нацыянальны склад ССМ Ашмянскага павету за 1933 г. Тут з 622 членаў арганізацыі палякамі былі 563 чалавекі, беларусамі з’яўляліся 49 і літоўцамі – 10 [15, с. 6]. Усяго ж па Віленскаму ваяводству ў 1934 г. у 248 гуртках ССМ было 3 610 членаў, з іх палякаў – 3 016, беларусаў – 395, літоўцаў – 140 чалавек. Тагачасная афіцыйная польская прэса заяўляла, што “усе яны без якой-небудзь нацыяналістычная нянавісці разам працуюць над вывядзеннем сваіх вёсак з цемры і галечы. Веліч гэтай задачы прымірае і гасіць усе антаганізмы, якія імкнецца прышчапіць нядобрасумленная палітычная агітацыя” [16, с. 8].

Пры гэтым неабходна адзначыць, што ўлады імкнуліся да таго, каб мясцовыя арганізацыі саюза ўзначальвалі менавіта палякі. Так, у адным з дакументаў аддзела грамадскай бяспекі Палескага ваяводства адзначалася, што “стварэнне змешаных арганізацый пажаданае пры ўмове, што кіраўніцтва такіх арганізацый павінна знаходзіцца ў польскіх руках і ў праўленнях павінен мець перавагу польскі элемент”. Той жа дакумент даручаў павятовым старастам праверыць, ці “не з’яўляецца наплыў непольскай моладзі ў гурткі сельскай моладзі планавай працай антыдзяржаўных элементаў з мэтай разгрому польскіх арганізацый на вёсцы” [17, арк. 12].

Дэкларацыйным заявам пра братэрства супярэчыла і дзейнасць ССМ – СМВ, якая на тэрыторыі Заходняй Беларусі насіла яўны паланізатарскі характар. Напрыклад, з мэтай прыцягнуць беларускую моладзь тэатральныя гурткі ССМ – СМВ час ад часу спрабавалі ставіць творы беларускіх аўтараў. Але гэта была дастаткова рэдкая з’ява, якую польскія ўлады лічылі не лаяльнай. У справаздачы аддзела грамадскай бяспекі Палескага ваяводства ў сувязі с дзейнасцю ССМ паведамлялася: “У канцы 1928 г., калі асобныя гурткі яшчэ знаходзіліся ў стадыі арганізацыі, сярод моладзі, якая цягнулася да гэтых гурткоў, можна было заўважыць тэндэнцыю да правядзення аматарскіх спектакляў пераважна толькі на ўкраінскай ці беларускай

мовах, зараз гэты кірунак цалкам змяніўся, і ўся моладзь на чале са сваім кіраўніцтвам з'яўляецца цалкам лаяльнай і добра настроенай у адносінах да польскай дзяржавы" [18, арк. 2]. Чысціня рэпертуару падтрымлівалася пры дапамозе адміністрацыйных сродкаў. Калі ў верасні 1934 г. у адной з вёсак Браслаўскага павету група моладзі з ССМ падрыхтавала спектакль па п'есе Я. Купалы "Паўлінка", ён быў забаронены па прычыне неадпаведна абсталяванай сцэны [19, с. 12].

Вельмі часта польскія ўлады выкарыстоўвалі "свае" маладзёжныя саюзы для ліквідацыі беларускіх нацыянальных асветніцкіх арганізацый. У адной са справаздач МУС Польшчы (канец 1929 г.) адзначалася: "Заслугоўвае ўвагі тое, што насельніцтва ў Віленскім і Навагрудскім ваяводствах у большасці выпадкаў цалкам абыякава ставіцца да дзеячаў Таварыства беларускай школы і акцыі, якую яны праводзяць. Гэта знаходзіцца ў пэўнай сувязі з ростам уплыву Саюза сельскай моладзі, асабліва на тэрыторыі Стаўбцоўскага і Нясвіжскага паветаў, дзе пацвярджаюцца выпадкі самастойнага роспуску гурткоў ТБШ пры адначасовым пераходзе іх членаў у Саюз сельскай моладзі" [20, с. 25]. У верасні 1932 г. камуністычная прэса, асвятляючы дзейнасць ТБШ, падкрэслівала, што "урад подкупам і запалохваннем імкнецца пасеяць у гуртках дух лаяльнасці да акупацыі, уцягнуць гурткі ў супрацоўніцтва са "Стральцом", Гурткамі сельскай моладзі (польскія мілітарысцкія арганізацыі), аддаць гурткі пад кіраўніцтва польскіх настаўнікаў і г.д." [21, с. 189].

Такім чынам, нацыянальнае пытанне знайшло пэўнае адлюстраванне ў ідэалогіі Саюза сельскай моладзі – Саюза маладой вёскі, вядучай праўрадавай арганізацыі міжваеннай польскай дзяржавы. У адносінах да яўрэйскай меншасці дэклараваліся пэўныя антысеміцкія пастулаты, яна трактавалася як чужы для польскай нацыі элемент, ад якога неабходна пазбавіцца шляхам эміграцыі. У адносінах жа да славянскіх меншасцяў абвяшчалася імкненне да братэрства. Але рэчаіснасць была вельмі далёкай ад ідэйных дэкларацый. Фактычна, на тэрыторыі Заходняй Беларусі ССМ – СМВ выкарыстоўваўся польскімі ўладамі ў якасці сродку паланізацыі маладых беларускіх вяскоўцаў і актыўна прыцягваўся для барацьбы с беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі.


1. Hillebrandt, B. Polskie organizacje młodzieżowe XIX i XX wieku: zarys historii / B. Hillebrandt. – Warszawa: MAW, 1986. – 479 s.
2. Małolepszy, E. Kultura fizyczna w działalności wiejskich organizacji młodzieżowych II Rzeczypospolitej / E. Małolepszy. – Częstochowa: Akademia im. Jana Długosza, 2015. – 242 s.
3. Kosmowska, I. Związki młodzieży polskiej od 1816 roku do naszych czasów / I. Kosmowska. – Warszawa: Księgarnia M. Ostaszewskiej i S-ki, 1924. – 196 s.
4. Mioduchowska, M. Centralny Związek Młodziezy Wiejskiej w województwie białostockim w latach 1912 – 1928 / M. Mioduchowska // Białostocczyzna. – 1986. – № 3. – S. 4 – 9.
5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 516.
6. Pruszkowski, A. Przewodnik społeczny / A. Pruszkowski. – Warszawa: Druk. P. Brzeziński, 1934. – 292 s.
7. Słownik organizacji młodzieżowych w Polsce 1918 – 1970 / Cz. Kozlowski [i in.]; pod red. Cz. Kozlowskiego. – Warszawa: Iskry, 1971. – 191 s.
8. Statut Centralnego Związku Młodej Wsi. – Warszawa: Warszawskie Zakłady Graficzne, 1935. – 20 s.
9. Budowa organizacyjna Poleskiego Wojewodskiego Związjzku Młodziezy Wiejskiej. – Brześć nad Bugiem: L. Pak, 1930. – 23 s.
10. Wytyczne ideowe Centralnego Związku Młodzieży Wiejskiej. – Warszawa: Ostoja, 1933. – 6 s.
11. Założenia ideowo-wychowawcze Centralnego Związku Mlodej Wsi // Siew Młodej Wsi. – 1937. – № 26 – 27. – S. 416 – 418.
12. Deklaracja ideowo-wychowawcza Centralnego Związku Mlodej Wsi. – Białystok: Nakładem Wojew. Związku Mlodej Wsi w Białymstoku, 1938. – 16 s.
13. Stanowisko Centr. Związku Młodej Wsi w sprawie żydowskiej // Życie Nowogródzkie. – 1937. – № 52. – S. 2.
14. Кулко млодзёжі вейскей // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 297.
15. Zew młodzieży wiejskiej. Jednodniówka ruchu młodowiejskiego pow. Oszmiańskiego. – Wilno: Znak, 1933. – 16 s.
16. Szanter, S. Działalność Zw. Młodzieży Wiejskiej Ziemi Wileńskiej / S. Szanter // Kurjer Wileński. – 1934. – 17 sierpnia. – S. 8.
17. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 483.
18. ДАБВ. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 714.
19. Малецкі, Я. Лісты / Я. Малецкі // Шлях моладзі. – 1934. – № 9. – С. 12.
20. Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za październik, listopad i grudzień 1929 r. – Warszawa: Wydział narodowościowy, 1930. – 140 s.
21. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы: Сб.: В 2 томах. Т. 2 (1929 – 1939 гг.) / Сост. И.П. Хovратович, Л.В. Аржаева, В.Н. Жигалов, Н.С. Орехво; Под ред. А.Н. Мацко, В.Н. Жигалова, Н.С. Орехво. – Минск: Беларусь, 1972. – 560 с.